Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

МАЗЫР ПРЫМАЕ «МАРАФОН АДЗІНСТВА» 4-5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 СНЕЖНЯ 2024 г. СУБОТА № 253 (30387)

# «Мы зробім усё, каб дзеці, у якіх чагосьці не хапае, нічым не адрозніваліся ад тых дзяцей, у якіх ёсць усё»

## Што Прэзідэнт параіў юным беларусам і за што падзякаваў настаўнікам

**«Нашы дзеці» — зноў у Палацы Рэспублікі. Вялікае дабрачыннае свята ўжо стала светлай навагодняй традыцыяй. У рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», якая кожны год праводзіцца па ініцыятыве і пад патранатам кіраўніка дзяржавы, у Палац Рэспублікі прыязджаюць дзеці-сіроты, дзеці са шматдзетных сем'яў, дзеці ваеннаслужачых, курсанты кадэцкіх вучылішчаў, дзеці, якія вызначыліся ў спорце, творчасці і вучобе. Сёлета на свята запрошана дэлегацыя з Латвіі. Па традыцыі з юнымі беларусамі сустракаецца і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Разам з кіраўніком дзяржавы адыходзячы год праводзілі больш за дзве тысячы дзяцей.**

СТАР. 2-3



Фота БелТА.





Дзяржаўны інтарэс

# СПРАВА ДЛЯ «ВЯЛІКАГА КАМЕНЯ»




**Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» стварыўся ў Беларусі як пляцоўка, якая дазваляе ўвасобіць у жыццё найбольш перадавыя, інавацыйныя бізнес-ідэі. Што атрымала рэалізацыю ў амаль ужо адышоўшым 2024 годзе і якія задачы ставіць перад сабой на надыходзячы 2025 год самы маштабны сумесны праект Беларусі і Кітая, расказаў «Звяздзе» першы намеснік кіраўніка адміністрацыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень» Пётр ЯКІМАЎ.**

СТАР. 8-9

ISSN 1990 — 763X

# «Мы зробім усё, каб дзеці, нічым не адрозніваліся ад











Пачаў беларускі лідар з падарункаў — для Дзеда Мароза і Снягуркі, якія — як жа інакш на свяце для дзяцей — таксама прысутнічалі на сцэне. «Увесь час бясплатна працуеце, не павінна так быць — у рыначнай эканоміцы жывём», — пажартаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на гэтым свяце сабралася самая складаная аўдыторыя.

> **«Тут людзі вельмі розныя. Розныя па ўзросце, розныя па пасадах. Члены ўрада, міністры і звычайныя школьнікі, якія толькі пачалі вучобу ў нашых школах. Але ўсіх нас сёння аб'ядноўвае адно — наперадзе вялікае, любімае свята — наш Новы год», — сказаў ён.**

## ЗА ЦЁМНАЙ ПАЛАСОЙ АБАВЯЗКОВА БУДЗЕ СВЕТЛАЯ

Прэзідэнт выказаў словы падзякі настаўнікам і выхавальнікам. «Думаю, дзеткі са мной пагодзяцца, і дарослыя дзеці, і зусім малыя. Без іх не было б гэтай дзеі, на якую вы прыехалі. Менавіта яны, пакінуўшы свае справы дамашнія, клопаты, як гэта звычайна бывае перад Новым годам, дапамаглі вам, дапамаглі мне, каб вы прыехалі сюды», — звярнуўся беларускі лідар да юных гасцей свята.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што на сваім досведзе ведае, як складана працаваць з дзецьмі.

> **«Дзецям хачу сказаць: вы думаеце, што з вамі лёгка? Нічога падобнага. З вамі цяжка. Але прыемна, калі вы даяце тыя вынікі, на якія разлічваюць вашы настаўнікі, выкладчыкі і вашы бацькі.**
> **Але, тым не менш, кажучы аб бацьках і выхавальніках, я разумею і яны разумеюць, што галоўнымі дзейнымі асобамі ў гэтай зале з'яўляецеся вы — нашы дзеці, маленькія і больш дарослыя», — сказаў Прэзідэнт.**

Менавіта для юных гасцей гэта свята, і ўсе, хто яго рыхтаваў, рабілі гэта дзеля таго, каб дзеці выйшлі з Палаца Рэспублікі шчаслівыя і з зіхатлівымі вачыма.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што яго словы аб тым, што з дзецьмі складана, — праўда, а не даніна модзе. Па яго словах, справа нават не ў тым, што ў зале сабраліся розныя людзі, а ў тым, што ў іх розныя лёсы і жыцці, і ў дзяцей таксама.

> **Хтосьці вучыцца добра, бо ў яго магчымасцяў больш, а хтосьці вучыцца вельмі добра, бо ў яго менш магчымасцяў, але ён працаўнік і ў яго імкненне добра вучыцца. «У сувязі з гэтым хачу вам сказаць (гэта тычыцца дзяцей і дарослых), што жыццё — як матроская цяльняшка: недзе цямнейшая паласа, недзе — святлейшая, недзе — зусім цёмная, недзе — зусім светлая. Гэта значыць, калі ў кагосьці сёння ёсць пэўныя турботы і чагосьці не хапае ў жыцці, памятайце, што за гэтай крыху цёмнай палоскай абавязкова будзе светлая паласа.**
> **І мы зробім усё, каб дзеці, у якіх чагосьці не хапае, нічым не адрозніваліся ад тых дзяцей, у якіх ёсць усё. Для гэтага і прызначана вялікае свята Новы год», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

## «ЁСЦЬ ТАКОЕ СЛОВА — «ТРЭБА»

Звяртаючыся да малых беларусаў, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што не стоміцца казаць ім аб вучобе. Ён пагадзіўся, што гэтыя размовы могуць і надакучыць, усюды кажуць аб тым, што трэба вучыцца. «Але вы ўжо засвоілі, што трэба вучыцца. Без гэтага нікуды. Вы бачыце, як ўскладнілася жыццё. Але вы малыя, маладыя, юныя зусім — у вас усё наперадзе, у вас светлая галава, нічым не загружаная. Дзейнічайце, загружайце яе тымі ведамі, якія вам стараюцца даць у школе, ВНУ і гэтак далей. Гэта вам будзе вельмі патрэбна ў жыцці. Для таго каб правільна вызначацца ў жыцці, сёння трэба вучыцца» — параіў беларускі лідар.

Ён адзначыў, што цудоўна разумее, як часам не хочацца нікуды ісці, нічога рабіць.

> **«Але ёсць такое слова (яго нядаўна на шчыт паднялі) — «трэба». Разумееце, трэба. Вось вы прачынаецеся, нікуды не хочаце ісці, тым больш вучыцца, але памятайце: цяпер гэта трэба для таго, каб потым было лягчэй. Так, вучоба — гэта складана, але трэба, бо гэта ваш фундамент у жыцці. Без гэтага фундамента ў вас не можа быць нармальнага дарослага жыцця», — падкрэсліў беларускі лідар.**

Ён пагадзіўся з тым, што бацькі, настаўнікі часам перабіраюць, калі пастаянна кажуць пра вучобу. «Пацярпіце. І памятайце, што гэта трэба. Трэба пацярпець», — параіў кіраўнік дзяржавы дзецям. Ён адзначыў, што гэта не святочныя размовы, але, тым не менш, сказаць пра гэта важна.

Закончыў сваё выступленне Прэзідэнт ужо па-святочнаму: шчыра павіншаваўшы ўсіх з Новым годам і шчыра падзякаваўшы ўсім за творчую працу, за цярпенне, «за тое, што вы прачынаецеся ранкам і кажаце, што трэба, трэба ісці на працу, трэба выхоўваць будучае пакаленне».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА і Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# у якіх чагосьці не хапае, тых дзяцей, у якіх ёсць усё»









**Уражанні**

## КАЛІ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА МАРЫ

**Для юных гасцей свята было падрыхтавана казачнае прадстаўленне «Формула новага года». Яе шукалі хлопчык Міхась і дзяўчынка Васіліса. Юныя героі з дапамогай чараўніцтва шукалі згублены элемент усярэдзіне велізарнай фантастычнай кнігі. Праваднікомм становіцца штучны інтэлект — дзяўчынка з імем Алеся. Аднак атмасфера свята ахінула дзяцей з самага пачатку, як толькі яны зайшлі ў Палац Рэспублікі. Аніматары, казачныя героі, музыка і танцы — усё гэта адразу задало адпаведны настрой.**

«Мяне перапаўняюць эмоцыі, што нават не хапае слоў, каб іх выказаць. І я вельмі рада, што сюды трапіла», — падзялілася Дар'я Пчолкіна.

«Я тут упершыню, і я ўражаны тым, як усё прыгожа. Забаўкі цудоўныя. Для мяне ўвогуле вялікі гонар — трапіць сюды і ўбачыць Прэзідэнта», — адзначыў Сяргей Клімаў. Хлопец сур'ёзны, але ў Дзеда Мароза верыць і паведаміў па сакрэце, што загадае яму добрых адзнак у дзённіку: Прэзідэнт сказаў, што трэба добра вучыцца, вось няхай і казачны дзед дапаможа.

Ксенія Трус з Віцебскай вобласці прызналася, што марыла трапіць на галоўную ёлку краіны і прыклала для гэтага максімум намаганняў. «Я разумела, што калі буду добра сябе паводзіць і вучыцца, то мяне сюды абавязкова запросяць. Я на гэта спадзявалася. І ўсё атрымалася», — раскрыла дзяўчынка свой сакрэт поспеху. Ксенія прызналася і аб чым марыць: «Я хачу, каб на Новы год ва ўсіх былі добрыя падарункі і ва ўсіх здзейсніліся жаданні, і Новы год прайшоў выдатна».

Дэлегацыі з рэгіёнаў прыехалі ў Мінск напярэдадні, таму ім пашанцавала крыху больш — у чацвер іх чакала культурная праграма. Сафія Рудай з Мазырскага раёна прызналася: акрамя таго, што здзейснілася мара апынуцца на галоўнай ёлцы краіны, яна наведала тэатр, і гэта таксама было незабыўна.



# ЧУЖОГА БОЛЮ НЕ БЫВАЕ

## Спікеры парламента пакінулі запісы ў кнізе спачуванняў у сувязі з крушэннем самалёта азербайджанскай авіякампаніі



Фота БелТА.

**Нагадаем, самалёт авіякампаніі Azerbaijan Airlines разбіўся на тэрыторыі Казахстана 25 снежня. На борце, які выконваў рэйс з Баку ў Грозны, знаходзілася 67 чалавек — грамадзяне Азербайджана, Кыргызстана, Казахстана і Расіі. Па раней агучаных даных, 38 чалавек загінулі, 29 пасажыраў выжылі.**

Як заўсёды гэта бывае, Беларусь суперажывае гору блізкіх нам народаў. Аб гэтым сведчаць і запісы ў кнізе спачуванняў, якія **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** пакінулі ў пасольстве Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь.

«Мы шчыра суперажываем гору дружалюбнага азербайджанскага народа, — сказана ў запісе, які Наталля Качанава пакінула ад імя Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. — Гэта трагедыя неймаверным болем адгукаецца ў сэрцах беларусаў. Выказваем спачуванне сем'ям, якія страцілі сваіх родных і блізкіх, і жадаем найхутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым».

Ігар Сергяенка таксама выказаў самыя шчырыя спачуванні ўсяму народу Азербайджана, родным і блізкім загінулых. «Трагедыя, якая прывяла да шматлікіх чалавечых ахвяр, нікога не пакінула абыякавым, — паведамляецца ў запісе ад імя Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. — У гэты цяжкі час нашы народы разам перажываюць горыч незаменнай страты».

Як паведаміў у размове з журналістамі **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Магерам АЛІЕЎ**, ніхто не чакаў такой трагедыі. «Трэба разабрацца з гэтым пытаннем, — удакладніў ён. — У нас створана дзяржаўная камісія, у яе ўвайшлі амаль усе міністры, яе ўзначальвае прэм'ер-міністр. Спадзяюся, што яны разбяруцца, бо шмат пытанняў, у якіх трэба аб'ектыўна разабрацца».

Пасол падкрэсліў, што гэта вялікая трагедыя для азербайджанскага народа. «Усе перажываюць. Дзякуй беларускаму народу, што разам з намі», — падкрэсліў дыпламат.

**Вераніка КАНЮТА.**

# З АСАБЛІВЫМ КЛОПАТАМ ДА КОЖНАГА ДЗІЦЯЦІ

## Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка ўзяў удзел у дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці»

**Учора, 27 снежня, кіраўнік урада здзейсніў рабочы візіт у Ваўкавыск, падчас якога прыняў удзел у традыцыйнай акцыі «Нашы дзеці», якая праводзіцца пад патранатам кіраўніка дзяржавы, і азнаёміўся з рэалізацыяй інвестыцыйнага праекта на прадпрыемстве «Беллакт».**

Кіраўнік урада наведаў Ваўкавыскі дзіцячы дом. Ён нагадаў, што Новы год — гэта самае галоўнае дзіцячае свята, і ўсе чакаюць падарункаў, ёлак, ранішнікаў.

— Ва ўсіх дзяцей, дзе б яны ні жылі, на якім кантыненце, у якой краіне, па-мойму, аднолькавыя адчуванні ад гэтага цудоўнага перыяду, — выказаў упэўненасць Раман Галоўчанка.

Гаворачы пра важнасць акцыі «Нашы дзеці», Раман Галоўчанка падкрэсліў яе ўнікальнасць: акцыі ў наступным годзе споўніцца 30 гадоў:

> — Добра вядома трапяткое стаўленне Прэзідэнта краіны да пытанняў клопату пра дзяцей. Тут можна ўспомніць 18-ы дэкрэт Кіраўніка дзяржавы аб дадатковых мерах па абароне інтарэсаў дзяцей і ўсё тое, што робіцца для таго, каб дзеці, у якой бы складанай жыццёвай сітуацыі ні апынуліся, адчулі, што пра іх клапоцяцца, самае галоўнае — іх бяспека павінна быць забяспечана безумоўна.

Раман Галоўчанка канстатаваў, што гэтая палітыка дае свае вынікі: у Беларусі актыўна развіваюцца іншыя формы выхавання дзяцей, акрамя ўстаноў інтэрнатнага тыпу:

— З 2011 года колькасць такіх устаноў, у якіх дзеці знаходзяцца пастаянна, скарацілася ў 2,5 раза. Гэта значыць, актыўна развіваюцца іншыя формы выхавання дзяцей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Гэта дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, якія замяшчаюць сем'і, куды актыўна перадаюцца дзеці. Таму што сямейнае выхаванне для нас з'яўляецца прыярытэтнай формай работы з дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, альбо з дзецьмі-сіротамі.

Напрыканцы ён нагадаў, што акцыя прадоўжыцца да 15 студзеня:

— Акцыя вельмі душэўная, вельмі кранальная. Гэта сапраўды мерапрыемства, якое ідзе знутры чалавека. І мы настолькі да гэтага прывыклі, што ўжо не ўяўляем сваё жыццё без таго, каб у гэты месяц не дарыць цяпло нашым дзецям.

### Тым часам

Падчас рабочай паездкі ў Ваўкавыскі раён Раман Галоўчанка азнаёміўся з падрыхтоўкай да адкрыцця цэха ААТ «Беллакт». Тут кіраўнік урада азнаёміўся з фінансава-гаспадарчай дзейнасцю прадпрыемства і перспектывамі яго развіцця, а таксама ходам рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Будаўніцтва цэха сухога дзіцячага харчавання па стандартах GMP».

Рэалізацыя гэтага праекта пачалася паўтара года таму. Па словах генеральнага дырэктара «Беллакт» Віталя Лупіка, ужо запушчаны ў работу праект цэха дзіцячага харчавання, які вельмі важны для краіны:

— Частка абсталявання ўжо закуплена, частка — у працэсе вырабу, частка — на праектаванні. Плюс на гэты момант ідзе праектаванне новага цэха. Ён будзе ўяўляць сабой незалежную, асобную пляцоўку.

Віталь Лупік адзначыў, што дадаткова будзе створана 60 рабочых месцаў.

Трэба сказаць, што рэалізацыя праекта дазволіць выпускаць 15 тысяч тон сухога дзіцячага харчавання ў год. Цяпер жа на прадпрыемстве выпускаецца 7,5 тысячы тон. З гэтага вынікае, што з увядзеннем у эксплуатацыю новага цэха аб'ём вытворчасці павялічыцца ў два разы.

— На гэтым этапе мы працуем практычна са стапрацэнтнай загрузкай цэха, таму будаўніцтва неабходна як для краіны, так і для нашых замежных партнёраў, — патлумачыў гендырэктар і звярнуў увагу, што дзіцячае харчаванне пастаўляецца ў 12 краін (сярод асноўных партнёраў — Расія, Пакістан, Узбекістан), вядзецца прапрацоўка ўзаемадзеяння яшчэ з шасцю краінамі.

У планах кіраўніцтва прадпрыемства — завяршыць рэалізацыю праекта ў 2027 годзе.

Акцыя

# МАЗЫРАНЕ СУСТРАКАЮЦЬ




**Ад вытворчых цэхаў прадпрыемстваў-флагманаў да ўстаноў адукацыі, культуры, навукі... Шматлікія цікавыя лакацыі чакаюць жыхароў з розных куткоў краіны ў Мазыры. У горадзе над Прыпяццю стартаваў першы дзень рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства».**

Уражанні

# Падарунак на Новы год

## Як прайшла самая маштабная экскурсія ў Палацы Незалежнасці

**Экскурсія ў Палац Незалежнасці — менавіта такі падарунак зрабіў Прэзідэнт кіраўніцтву органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, якія 27 снежня наведалі жамчужыну мінскага патрыятычнага квартала разам са сваімі жонкамі.**









Варта адзначыць, што гэта самая маштабная экскурсія за ўсю гісторыю наведванняў. Так, у гэты дзень тут сабралася больш за 400 чалавек з усёй краіны. Усім ім кіраўнік дзяржавы перадаў цёплыя віншаванні праз свайго **прэс-сакратара Наталлю ЭЙСМАНТ:**

— Прэзідэнт сказаў так: «Пажадай усім, хто тут збярэцца, самымі простымі словамі самага галоўнага: спакою і міру. І няхай вы вельмі часта цяпер прамаўляеце гэтыя словы, але каштоўнасць іх ад гэтага, вядома, не губляецца, а толькі ўзрастае. Спакою і міру нашай краіне, кожнай сям'і, і няхай у вас дома ўсё будзе добра».

На экскурсіі прысутнічаў таксама і **міністр унутрных спраў Іван КУБРАКОЎ.** Ён падкрэсліў, што для ведамства гэта вельмі важнае ідэалагічнае мерапрыемства.

— Міліцыя заўсёды была побач з нашым Прэзідэнтам, заўсёды гарантавала бяспеку ў краіне. Але пасля гэтай экскурсіі мы будзем рабіць гэта яшчэ больш якасна: гонар і натхненне зашкальваюць. Я бачу, як гараць вочы ў нашых супрацоўнікаў...

Асабліва ўдзячныя жонкі сілавікоў. Многія з іх пражываюць за некалькі сотняў кіламетраў адсюль, і магчымасць трапіць у сталіцу здараецца нячаста. А тут — Палац Незалежнасці ва ўсёй сваёй красе. Чым не спраўджаная навагодняя мара?

На экскурсіі сабраліся кіраўнікі ведамстваў з усёй краіны, нават з самых невялікіх райцэнтраў. Так, нашу ўвагу прыцягнулі дзве пары, якія рабілі фотаздымкі на фоне прыгажосцяў палаца. Аказалася, што гэта прадстаўнікі Гомельскай вобласці. **Начальнік Жыткавіцкага РАУС Аляксандр АХРАМОВІЧ** з жонкай Алесяй тут упершыню.

— Эмоцыі зашкальваюць ад усёй гэтай моцы, прыгажосці і вытанчанасці. Перад паездкай сюды чыталі інфармацыю аб палацы, нават глядзелі віртуальны тур, таму ўжо меркавалі, што тут будзе.

А вось **начальнік Петрыкаўскага РАУС Віталь МАРКЕВІЧ** пару гадоў таму ўжо быў на экскурсіі ў Палацы Незалежнасці. Аднак, паводле яго слоў, тут можна пабываць шмат разоў і ўражанні ўсё роўна будуць яркімі.

— Вельмі важна, што наведванне палаца прадугледжана разам з жонкай. Мы рэдка бачымся ў сувязі са службовай дзейнасцю. Я працую ў Петрыкаве, а сям'я жыве ў Жыткавічах — гэта 50 кіламетраў, бачымся мы толькі на выхадныя, — дадаў ён.

Цікава, што яго жонка Аксана адразу не паверыла, што іх чакае такі навагодні падарунак. Сумненні канчаткова зніклі, толькі калі яна ўбачыла запрашальныя на свае вочы. Эмоцый было шмат.

Ідзём далей і бачым прыгожую пару, якая разглядае экспазіцыю са Слуцкім поясам. Гэта **намеснік начальніка УУС Брэсцкага аблвыканкама, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Віталь КАЗЛОЎ** разам з жонкай Наталляй.

— Я ўжо быў па абавязку службы на гэтым аб'екце, у тым ліку на экскурсіі. Кожны раз сюды трапляючы, зноў захапляюся яго пышнасцю. Гэта квінтэсэнцыя нашых беларускіх традыцый і дасягненняў, у тым ліку і на міжнароднай арэне. Гонар бярэ за тое, што такі аб'ект у нас ёсць, — адзначыў ён.

Наталля таксама прызналася, што наведванне палаца было даўняй марай. І такі навагодні падарунак яшчэ раз упэўніў яе ў тым, што калі вельмі моцна верыць, то ўсё спраўдзіцца.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

# ГАСЦЕЙ... і адкрываюць новае разам з усёй краінай

По традыцыі свята яднае калектывы, арганізацыі, прадпрыемствы, грамадскія аб'яднанні. У Мазыры да ўдзелу ў рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі падключыліся ўстановы адукацыі і культуры. Адной з пляцовак «Марафону адзінства» стаў Мазырскі дзяржаўны медыцынскі каледж. Тут адкрылася выстава дасягненняў і распрацовак сферы аховы здароўя Гомельшчыны. Вядучыя ўстановы медыцыны, санэпідслужбы, фармацэўтыкі, профільныя навучальныя ўстановы рэгіёна расказалі аб сваёй дзейнасці, прадставілі інавацыйныя распрацоўкі ў галіне медыцыны і фармацыі, тэст-сістэмы лячэбнага і дыягнастычнага працэсаў.



У праграме «Марафону адзінства» — асобны падарунак аматарам музыкі, танцаў, сучаснай і класічнай харэаграфіі... У Мазырскім драматычным тэатры імя Івана Мележа разгарнулася маштабная лакацыя Вялікага тэатра Беларусі: падрыхтаваны майстар-класы артыстаў балета і выступленні салістаў оперы. Прадстаўлены і знакавыя выставачныя праекты: «Вялікі тэатр Беларусі: Гісторыя ідэі» і «Патэтычны дзённік памяці», створаны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Мазырскі дзяржаўны каледж будаўнікоў прыняў удзельнікаў «НЯсумнай НЯлекцыі». Гасцямі адкрытай, жывой сустрэчы сталі намеснік міністра адукацыі Беларусі Кацярына Пятруцкая і **старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА.** Кіраўнік раёна падзялілася сваёй гісторыяй выбару прафесіі: быць актыўнымі, зацікаўленымі, ісці да мэты — і поспех не прымусіць сябе доўга чакаць...

— Гэта вельмі знакава для нашых гараджан, для гасцей горада і раёна. Гэта, сапраўды, падарунак для мазыран, — шчырую ўдзячнасць за магчымасць для Мазыра стаць часцінкай народнага праекта «Марафон адзінства» выказала Алена Паўлечка. — Мы вельмі любім наш горад. Штогод у райцэнтры ўводзяць новыя сацыяльныя аб'екты. У першую чаргу яны для нашай моладзі. Улічваючы тое, што Мазыр — горад малады і за здаровы лад жыцця, адкрыццё фізкультурна-аздараўленчага цэнтра «Палессе-Арэна» — яшчэ адзін падарунак напярэдадні навагодніх свят мазыранам, гасцям. Будзе вельмі масава, эмацыянальна і актыўна, — падкрэсліла кіраўнік раёна.

Больш падрабязна пра «Марафон адзінства» ў Мазыры чытайце ў наступным нумары газеты.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**



***Беларуская пушча і іншыя нацыянальныя паркі, Бярэзінскі біясферны запаведнік, бяскрайнія лясы з дзівосным раслінным і жывёльным светам, блакітныя азёры — не проста бясцэнны дар ад Бога і продкаў. Гэта тое, што мы павінны былі і будзем перадаваць нашчадкам у некранутым выглядзе.***

*Аляксандр Лукашэнка на ўрачыстай цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод работнікам прадпрыемстваў і арганізацый сістэмы Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта ў Палацы Незалежнасці.*
*1 жніўня 2024 года.*

# Дзяржаўная абарона як гарантыя захавання старажытнага кутка прыроды для нашчадкаў

**Уладзіслаў ЦЕЦЯРОНАК, генеральны дырэктар Нацыянальнага парка «Белавежская пушча»:**

— Любы вандроўнік, які трапляе ў першы рэгіён, стараецца пабываць у Белавежскай пушчы. Пра пушчу напісаны кнігі, складзены песні, створаны шэраг публіцыстычных твораў. Але з нашых пісьменнікаў найлепш, відаць, ухапіў сутнасць векавога лесу Уладзімір Караткевіч у сваім слове пра «гэтыя самы лепшы куток старажытнай нашай краіны», дзе можна застаць сам-насам з аленямі і зубрамі, з аксамітнымі грабамі і вузлаватымі дубамі, з сумленнем, з чалавечнасцю, з усёй гэтай добрай і адвечнай беларускай зямлёй. Пісьменнік называе пушчу скарбам для ўсіх на свеце людзей.

У снежні 1992 года Белавежская пушча была ўключана ў Спіс прыродных аб'ектаў Сусветнай спадчыны чалавецтва, у які ўваходзяць найбольш значныя прыродныя аб'екты свету (у адным шэрагу з возерам Байкал, дажджавымі лясамі Амазонкі, вадаспадам Вікторыя, Далёкаўсходняй далінай гейзераў). Дарэчы, пушча стала першым аб'ектам на тэрыторыі былога СССР, удастоенай такога высокага звання.

Сёння Нацыянальны парк «Белавежская пушча» ўяўляе сабой адзін з найбуйнейшых лясных масіваў раўніннай Еўропы, які захаваўся да нашых дзён у адносна непарушным стане. Сучасная тэрыторыя нацпарка складае 150 тысяч гектараў, у пушчы налічваецца звыш 1 тысячы відаў флоры і 12 тысяч відаў фаўны. Сярэдні ўзрост дрэў складае каля сотні гадоў, ёсць і старажылы — 600-гадовыя дубы. Многія прадстаўнікі жывёльнага і расліннага свету занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Прыродаахоўны статус Белавежскай пушчы застаецца нязменным многія дзесяцігоддзі. Менавіта дзяржаўная абарона дапамагае захаваць для нашчадкаў старажытны куток прыроды. І сёння, нягледзячы на любыя перашкоды (якой, напрыклад, з'яўляецца бетонная агароджа, узведзеная з польскага боку, што парушае асобныя законы экасістэмы), калектыў нашага нацыянальнага парку робіць усё, каб лясы, балоты, азёры, рэкі са звяр'ём і птаствам заставаліся нязменнымі. Над гэтым старанна працуе навуковы аддзел, заўсёды на варце — служба аховы пушчы. Мы ўсведамляем пачэсную задачу: годна захаваць прыродны скарб для наступных пакаленняў, і прыкладаем штодзённыя намаганні для яе вырашэння.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Нашы брэнды

# ЧАРГОВЫ ТЫТУЛ «БАЦЬКАВАЙ БУЛКІ»

## Каравай-фэст у ліку лаўрэатаў XXII Рэспубліканскага конкурсу «Пазнай Беларусь»

**Свята стала найлепшым сярод падзейных мерапрыемстваў 2024 года, хоць і прайшло сёлета толькі ў трэці раз. Але за гэты час паспела прынесці сапраўдную славу гораду Свіслачы і яго гасцінным жыхарам. Фэст атрымаў высокую ацэнку кіраўніка дзяржавы. У студзені аргкамітэт «Бацькавай булкі» узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта дзеячам навукі і культуры. Чарговае прызнанне фестываль атрымаў і ў турыстычнай сферы — гэта адбылося ў снежні.**

**Загадчыца сектара культуры Свіслацкага райвыканкама Ірына ГУТАР** дзеліцца яшчэ зусім свежымі ўражаннямі. Кажа, што ўжо ў кулуарах конкурсу, які нядаўна прайшоў у сталіцы, яна ўпэўнілася, што пра іх фэст ведае ўся краіна. «О! Бацькава булка!» — чулі прадстаўнікі свіслацкай дэлегацыі, калі адказвалі на пытанне, адкуль яны. І сапраўды, за тры гады свята вырасла да вялікага хлебнага фэсту, які загучаў на ўсю краіну.

— 27 і 28 снежня мы прадстаўляем свой фэст на адкрыцці ў Мінску Міжнароднага выставачнага цэнтра. У цырымоніі — дэгустацыя нашай знакамітай пляцёнкі з яе традыцыйнай рэцэптурай і натуральнымі інгрэдыентамі, — паведаміла Ірына Гутар.

Дарэчы, выпякаецца пляцёнка ў хлебным цэху ў Свіслачы. Менавіта гэту вытворчасць наведаў Прэзідэнт некалькі гадоў таму. Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў смак свіслацкага хлеба, асабліва здобнай пляцёнкі, якая нагадала яму дзяцінства. Пасля таго як у тэлеэфіры прайшоў гэты сюжэт, мясцовыя жыхары сталі пытацца ў крамах пра хлеб, які каштаваў Прэзідэнт. Гэта стала свайго роду пасылам для раскруткі пляцёнкі, якая ў хуткім часе атрымала афіцыйную назву «Бацькава булка». Яе рэалізацыя значна павялічылася. Выраб паступае ў мясцовыя крамы, у прыватнасці ў гандлёвы павільён «Гарачы хлеб», дзе даволі хутка раскупляецца. Спрыяе гэтаму і знакаміты фестываль.

Сёлета свята прайшло асабліва маштабна. Было нямала новых лакацый. З'явіўся стылізаваны сялянскі дом, дзе размясціў усе віды хлеба, якія занесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. У ліку такіх вырабаў — поразаўская банкуха, ваўкавыскі і слонімскі вясельныя караваі, жытні хлеб з Жораўкі і Кузьмічоў Мінскай вобласці, грачаны хлеб з Маларыты, хатні хлеб з Адэльска Гродзенскага раёна. «Яны розныя, але адпавядаюць тым рэгіёнам, дзе захаваліся традыцыі іх выпечкі. І на фестывалі мы паказваем, як аднаўляецца старажытная рэцэптура, а вырабам нашых дзядоў і прадзедаў даецца новае жыццё», — робіць акцэнт суразмоўніца.



Яна расказала, што сёлета тэрыторыя фэсту значна пашырылася, павялічылася колькасць месцаў для наведвальнікаў. Для людзей былі створаны спрыяльныя ўмовы: працавала шмат гастратракаў з пасадачнымі месцамі, сцэнічная пляцоўка таксама была вялікай, усе ахвотныя маглі сесці, паслухаць канцэрт ці пакаштаваць самыя разнастайныя стравы. Гэта стала важным аспектам у турыстычным складніку свята, які быў прадстаўлены на конкурсе «Пазнай Беларусь» як элемент падзейнага турызму.

У 2025 годзе свята павінна прайсці з яшчэ больш вялікім размахам і новымі элементамі.

— Літаральна з пачатку года мы пачнём падрыхтоўку да новага, чацвёртага па ліку фестывалю, — расказвае пра планы Ірына Гутар. — Збіраецца аргкамітэт, усё абмяркоўваецца на ўзроўні абласнога і раённага кіраўніцтва. Трэба сказаць, што новы старшыня райвыканкама Андрэй Грыцкевіч, які нядаўна заняў гэту пасаду, таксама вельмі зацікаўлены ў тым, каб свята адбылося на самым высокім узроўні. Думаю, так і будзе, бо наш пастаянны рэжысёр Вольга Багдановіч — сапраўдны генератар ідэй. Пры гэтым кожны можа выказаць свае прапановы. У выніку атрымліваюцца арыгінальныя рэчы.

Напрыклад, адным з такіх цікавых рашэнняў стаў «Хутарок па-гаспадарску» — пляцоўка з травянымі дахамі і лаўкамі — насціламі. Аказалася, што чарот для гэтага нарыхтоўваюць самі работнікі культуры, сушаць яго і потым раскладваюць па радах для адпачынку. Мяркуецца, што такая пляцоўка будзе ўладкавана і на чарговым фестывалі.

Застануцца і традыцыйныя лакацыі, якія спадабаліся і ўдзельнікам свята, і наведвальнікам. Напрыклад, конкурсы на самы прыгожы каравай, майстар-класы па выпечцы. Як зазначыла суразмоўніца, важна паказаць вытокі нашага сённяшняга хлебнага багацця і тое, як яно памнажаецца. «Маладое пакаленне павінна ведаць, як вырошчваецца хлеб, як да яго ставіліся нашы продкі. Бо для беларуса хлеб заўсёды быў самай вялікай каштоўнасцю. Мы хочам гэту традыцыю захаваць», — запэўніла Ірына Гутар.

Яна заўважыла, што даволі салідным чакаецца і спіс удзельнікаў канцэртнай праграмы. Для беларускіх выканаўцаў стала прэстыжна браць удзел у святочным канцэрце. Прыязджаюць і расійскія артысты. Напрыклад, сёлета выступаў гурт «Міраж». У хуткім часе будзе сфарміраваны сцэнарны план выканаўцаў.

— Наша «Булка» стала прыцягваць турыстаў, стала вядомай не толькі ў нашай краіне, але і за межамі, аб чым сведчылі машыны з іншаземнымі нумарамі. А пасля заключнага канцэрта ад Свіслачы ад'язджала проста небывалая колькасць машын. Нам цяпер трэба трымаць тую высокую планку, якая была заяўлена на сёлетнім каравай-фэсце, — падкрэсліла ў размове прадстаўнік аргкамітэта.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**КРАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Логойский район, Крайский сельсовет, д. Тихоновичи, д. 14А,** имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме:**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 11х6 м.
Площадь: 25 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1948 г.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.
Подземная этажность: отсутствует.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Антоневич Павел Антонович, умер 05.12.2011 г. Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 5 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Крайский сельский исполнительный комитет уведомлений не поступало о намерении использовать дом для проживания.

Крайский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения в связи с тем, что правообладатели неизвестны или неизвестно место их фактического проживания либо место нахождения, уведомить Крайский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Наш адрес: **223138, аг. Крайск, ул. Буденного, 8, Логойский район, Минская область.** Электронный адрес: **kraysk@logoysk.gov.by.**

Телефоны для справок: **80177473636, 73635.**

УНП 600181643

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**КРАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Логойский район, Крайский сельсовет, д. Деревно, д. 1,** имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме:**
Наружные размеры одноквартирного блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 6х7 м.
Площадь: 42 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного, блокированного жилого дома (квартиры в блокированном жилом доме): 1958 г.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.
Подземная этажность: отсутствует.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный, блокированный жилой дом (квартира в блокированном жилом доме) принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Кабак Мария Юльяновна 01.07.1921 г. р., Пазычук Татьяна Анатольевна.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, блокированном жилом доме (квартире в блокированном жилом доме) собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом (квартирой): более 10 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Крайский сельский исполнительный комитет уведомлений не поступало о намерении использовать дом для проживания.

Крайский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения в связи с тем, что правообладатели неизвестны или неизвестно место их фактического проживания либо место нахождения, уведомить Крайский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Наш адрес: **223138, аг. Крайск, ул. Буденного, 8, Логойский район, Минская область.** Электронный адрес: **kraysk@logoysk.gov.by.**

Телефоны для справок: **80177473636, 73635.**

УНП 600181643

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**КРАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Логойский район, Крайский сельсовет, д. Гриневичи, ул. Каменная, д. 15,** имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме:**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 5х7 м.
Площадь: сведения отсутствуют.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: сведения отсутствуют.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.
Подземная этажность: отсутствует.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): сведения отсутствуют. Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 5 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Крайский сельский исполнительный комитет уведомлений не поступало о намерении использовать дом для проживания.

Крайский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения в связи с тем, что правообладатели неизвестны или неизвестно место их фактического проживания либо место нахождения, уведомить Крайский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Наш адрес: **223138, аг. Крайск, ул. Буденного, 8, Логойский район, Минская область.** Электронный адрес: **kraysk@logoysk.gov.by.**

Телефоны для справок: **80177473636, 73635.**

УНП 600181643

Беларусь лічбавая

# Ад банкаў да экалогіі

## Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу «Лідары лічбавай эканомікі — 2024»

**Самая чаканая падзея для распрацоўшчыкаў лічбавых і інавацыйных рашэнняў нашай краіны — цырымонія ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Лідары лічбавай эканомікі — 2024» — па традыцыі адбылася напярэдадні Новага года.**

Мэта інтэлектуальнага спаборніцтва — актывізацыя лічбавага развіцця Беларусі, выяўленне найбольш эфектыўных і інавацыйных лічбавых рашэнняў для розных сфер эканомікі. Праводзіцца конкурс пры падтрымцы Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі, кафедры лічбавых сістэм і тэхналогій Інстытута бізнесу БДУ, шэрагу іншых экспертных арганізацый.

Пераможцаў вызначала прафесійнае журы — больш за 20 вядучых вучоных і экспертаў лічбавай сферы, самых аўтарытэтных спецыялістаў Беларусі ў галіне лічбавізацыі і лічбавай трансфармацыі. Найбольшая колькасць праектаў на іх разгляд і ацэнку была прадстаўлена ў намінацыі «Банкаўская і фінансавая дзейнасць». Лідзіравалі па колькасці ўдзельнікаў таксама намінацыі «Энергетыка», «Лічбавы ўрад», «Транспарт і лагістыка». Былі на конкурсе і такія раздзелы, як «Машынабудаванне», «Экалогія і ахова навакольнага асяроддзя», «Сувязь і інфармацыйная інфраструктура», «Харчовая прадукцыя» — спектр прымянення лічбавых рашэнняў у сучасным свеце вельмі шырокі.



### Хто ў пераможцах?

Па выніках конкурсу, у гэтым годзе дыпломы I ступені за свае распрацоўкі атрымалі 19 кампаній. А на Гран-пры прэтэндавалі пяць найбольш значных праектаў. Уладальнікам найвышэйшай узнагароды конкурсу «Лідары лічбавай эканомікі — 2024» журы назвала УП «Навукова-інжынернае прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сістэмы». Распрацоўка кампаніі — рэсурс па кругласутачным прадастаўленні актуальнай інфармацыі для органаў дзяржаўнага кіравання. Праграма дае магчымасць апрацоўваць спадарожнікавыя здымкі з метэаралагічных касмічных апаратаў з мэтай пошуку цеплавых анамалій (пажараў), што дапамагае рабоце МНС і Міністэрства лясной гаспадаркі.

Сярод пераможцаў — ААТ «Савушкін прадукт» (праграмна-апаратныя комплексы па ўсім цыкле перапрацоўкі малака, ад прыёмкі да адгрузкі гатовай прадукцыі), ТАА «СінРубЭнерга» (лічбавыя энергааб'екты і ініцыятывы «Разумнага горада») — дарэчы, менавіта гэтай кампаніяй быў распрацаваны і укаранёны комплекс лічбавых аўтаматызаваных сістэм кіравання элементамі інфраструктуры Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

### Выбар экспертаў

У намінацыі «Лічбавы ўрад» (адной з тых, дзе на суд журы была прадстаўлена найбольшая колькасць праектаў) перамогу заваяваў Нацыянальны цэнтр электронных паслуг. Мабільны дадатак «Е-Паслуга» прызнаны найлепшым праграмным прадуктам 2024 года. Дадатак дае доступ да асабістага кабінета адзінага партала электронных паслуг.

— Доступ да большасці электронных паслуг на партале патрабуе адназначнай строгай ідэнтыфікацыі карыстальніка, якая магчыма пры наяўнасці электроннага лічбавага подпісу або ID-карткі. Карыстальнік можа аўтарызавацца з дапамогай ID-карткі на партале, атрымаць доступ да свайго асабістага кабінета і замовіць паслугу, не выходзячы з дому: ID-картка — не толькі пасведчанне асобы, але і носьбіт двух дадаткаў, ідэнтыфікацыйнага і электроннага лічбавага подпісу. Каб спрасціць карыстальнікам працэдуру аўтарызацыі па ID-картцы і даць доступ да электронных паслуг партала, мы распрацавалі мабільны дадатак «Е-Паслуга», у якім даныя ID-карткі перадаюцца на мабільную прыладу праз модуль NFC, — адзначыў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг Раман ГРАДУСАЎ.** — Прыклаўшы ID-картку да тыльнага боку смартфона, трэба ўвесці PIN 1 і актываваць свой асабісты кабінет на партале «Е-Паслуга».

На партале даступны 639 відаў паслуг і адміністрацыйных працэдур для грамадзян і бізнесу. Сёлета штомесяц аказвалася каля 11 мільёнаў электронных паслуг.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Актуальна

# АДХОДЫ Ў ДАХОДЫ

## Як сартаваць смецце згодна з новымі правіламі?

**З 1 снежня абноўлены Тэхнічны кодэкс практыкі абыходжання з камунальнымі адходамі. Згодна з ім, усе мы павінны сартаваць пэўныя віды камунальных адходаў, у прыватнасці, асобна збіраць шкло, паперу, пластык, метал. Акрамя таго, уведзены новыя правілы па ўтылізацыі адходаў расліннасці і будаўнічых матэрыялаў.**



### КОМПЛЕКСНАЯ СТРАТЭГІЯ

У Беларусі штогод утвараецца каля чатырох мільёнаў тон цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) за год. Прычым сёння кожны жыхар нашай краіны пакідае пасля сябе ў сярэднім у 2,5 раза больш смецця, чым 30 гадоў таму. Паводле звестак Белстата, на аднаго беларуса прыпадае 433,9 кг камунальных адходаў за год. Напрыклад, у 1997 годзе гэты паказчык не перавышаў 177 кг на чалавека, у 2019 — 401,8 кг.

Выкарыстоўваецца сёння больш за трэць таго аб'ёму камунальных адходаў, які ўтвараецца ў нашай краіне. У Беларусі па выніках мінулага года гэты паказчык склаў 35,5 працэнта, а сёлета за 9 месяцаў дасягнуў ужо 37,9 працэнта. Пры гэтым 12 гадоў таму на перапрацоўку адпраўлялася толькі 10 працэнтаў адходаў, што ўтвараюцца ў насельніцтва. Такім чынам, за гэты час узровень выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў у нашай краіне вырас больш як у тры разы.

— Галоўнае, што ўдалося дабіцца ўстойлівага росту выкарыстання камунальных адходаў. I мы з'яўляемся лідарамі па гэтым паказчыку сярод краін Еўразійскага эканамічнага саюза і СНД, — адзначыла **дырэктар дзяржаўнай установы «Апаратар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Аксана ГАЙДУК.** — У перспектыве задачы напружаныя: дасягнуць да 70 працэнтаў выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў у 2030 годзе і да 90 працэнтаў — у 2035 годзе.

Сутнасць нацыянальнай стратэгіі ў абыходжанні з адходамі — як мага больш іх перапрацоўваць і як мага менш захоўваць на смеццевых палігонах. Для гэтага мадэрнізуецца, удасканальваецца ўся сістэма абыходжання з камунальнымі адходамі, развіваюцца магутнасці па сартаванні, укараняюцца новыя метады і тэхналогіі выкарыстання ЦКА.

### ШТО І ЯК САРТАВАЦЬ?

Новыя правілы прадугледжваюць адзіныя патрабаванні да абыходжання з асобнымі відамі камунальных адходаў, якія ўтвараюцца ў насельніцтва, напрыклад, з расліннымі і будаўнічымі, а таксама раздзельны вываз кантэйнераў для другасных рэсурсаў і для змешаных камунальных адходаў.

Сартаваць бытавыя адходы — наш абавязак па законе. Калі створаны ўмовы для раздзельнага збору, у двары маюцца кантэйнеры для другрэсурсаў — жыхары абавязаны сартаваць. Што будзе, калі не сартаваць? За гэта можна атрымаць штраф у памеры да 30 базавых велічынь.

Па адходах расліннасці ў Беларусі прыняты асобныя тэхнічныя патрабаванні. Апалую лістоту, сарваную або скошаную траву, абрэзкі галін, кустоў уладальнікі зямельных участкаў павінны кампаставаць ці вывозіць у рамках асобнай паслугі. Для гэтага неабходна будзе заключыць дагавор з юрыдычнымі асобамі, якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі, або з арганізацыямі, якія аказваюць паслугі па абыходжанні з камунальнымі адходамі. Выкідваць раслінныя адходы ў кантэйнеры для другасных рэсурсаў забаронена.

Матэрыялы, якія ўтвараюцца ў працэсе рамонту фізічнымі асобамі жылых памяшканняў — аддзелачныя матэрыялы, аконныя рамы, рэшткі старога лінолеуму, ламінату, старыя рукамыйнікі, карнізы, плінтусы і інш., што засталося пасля рамонту, можна пакінуць на спецыяльных пляцоўках для збору буйнагабарытных адходаў. Часам для іх збору ўсталёўваюць асобныя бункеры. Катэгарычна забараняецца выкідваць будаўнічыя адходы ў кантэйнеры для змешаных другасных рэсурсаў або для звычайнага камунальнага смецця (ЦКА). Тое ж датычыцца драўніны і мэблі, зношаных шын і адпрацаваных аўтамасел. Іх таксама можна пакідаць на пляцоўках для збору буйнагабарытных адходаў.

**Алена КРАВЕЦ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00013** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** ОАО «Знамя индустриализации», 210017, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Гагарина, 11.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12; +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 16.01.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-202473 площадью 5187,90 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 11-1 (места общего пользования), назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, на подвальном этаже – лестничная клетка – 15,5 кв. м; на 1 этаже – лестничная клетка – 19,7 кв. м, лестничная клетка – 16,6 кв. м, тамбур – 7,1 кв. м, бетонное крыльцо – 9 кв. м, бетонное крыльцо – 3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером № 240100000001005132, площадью 4 2264 га (общая долевая аренда).

**Объекты недвижимости имеют обременения:**

1. Ипотека, залогодержатель – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь – Республиканское унитарное производственно-торговое предприятие «Оршанский льнокомбинат».

2. Договора аренды № 10 от 01.10.2023 действует по 30.09.2026, № 10 от 01.07.2021 действует по 29.06.2025, № 6 от 01.04.2023 действует по 31.03.2027, № 7 от 17.04.2023 действует по 16.04.2026, № 8 от 01.07.2023 действует по 30.06.2026, № 3 от 29.02.2024 действует по 28.02.2025, № 13 от 08.11.2022 действует по 07.11.2024.

**Нач. цена: 3 100 800,00 бел. руб. без учета НДС.**

**Задаток: 310 080, 00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by.

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 15.01.2025.**

После принятия соответствующего решения – обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и предмета аукциона, а в случае предоставления земельного участка на праве аренды – заключить договор аренды земельного участка и обратиться за его государственной регистрацией.

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «Счастье приключается»

**Сведения об Организаторе рекламной игры:** общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 года Минским горисполкомом.

**Местонахождение Организатора:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

**Наименование рекламной игры: «Счастье приключается».**

Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, выдано Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры от 28.08.2024 № 4463.

Период проведения рекламной игры: с 10.09.2024 по 06.02.2025.

Количество участников рекламной игры составило 1050 человек.

Розыгрыши призов были проведены по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

**График проведения розыгрышей:**

| Номер розыгрыша | Дата и время розыгрыша |
|---|---|
| 1 | 20.09.2024 в 15:00 |
| 2 | 27.09.2024 в 15:00 |
| 3 | 04.10.2024 в 15:00 |
| 4 | 11.10.2024 в 15:00 |
| 5 | 18.10.2024 в 15:00 |
| 6 | 25.10.2024 в 15:00 |
| 7 | 01.11.2024 в 15:00 |
| 8 | 11.11.2024 в 15:00 |
| 9 | 15.11.2024 в 15:00 |
| 10 | 22.11.2024 в 15:00 |
| 11 | 29.11.2024 в 15:00 |
| 12 | 06.12.2024 в 15:00 |
| 13 | 06.12.2024 в 15:30 |

**Победители, выигравшие Приз 1 Электронный подарочный сертификат oz.by на сумму 100 (сто) белорусских рублей стоимостью 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек:** Савошко В.В., Трембович А.В., Ралько Е.А., Шарко М.А., Шереметова О.А., Жушма А.В., Сергун В.В., Турко А.М., Семенякина С.В., Каборда А.К., Гетова А.В., Куцевич О.И.

**Победители, выигравшие Приз 2 Электронный подарочный сертификат «Детмир» стоимостью 200,00 (двести) белорусских рублей:** Камок-Усова Т.Л., Цесаренко Д.Э., Силаньтьева А.А., Ашурко Д.А., Корнилов В.С., Горбунова С.В., Чижик К.В., Инанец С.В., Злотникова Т.В., Пашковская Н.А., Леонов А.Г., Романовский Д.С.

**Победители, выигравшие Приз 3 Умная колонка Яндекс Станция Лайт YNDX-00025Y (желтый/лимон) стоимостью 179,00 (сто семьдесят девять) белорусских рублей 00 копеек:** Липницкая А.А., Савенок Д.В., Шукало И.В., Иванчук С.В.

**Победители, выигравшие Приз 4 Умные часы детские Huawei Watch Kids 4 Pro Model ASN-AL10 Blue стоимостью 350,00 (триста пятьдесят) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 21,22 (двадцать один рубль 22 копейки):** Герасимчик Н.В., Курякова Е.С., Котченко Д.А., Яковин К.С.

**Победители, выигравшие Приз 5 Сертификат на услуги по организации и проведению семейной фотосессии номиналом 500 (пятьсот) белорусских рублей.** Срок действия до 01 сентября 2025 г. (Включает: аренду фотостудии – 1 час, работу фотографа – 1 час, обработку и цветокоррекцию фотографий, 100 готовых фотографий) стоимостью 500,00 (пятьсот) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 43,63 (сорок три белорусских рубля 63 копейки): Матовицкая М.Г., Питкевич В.С., Вабищевич О.В., Зеневич А.М.

**Победители, выигравшие Приз 6 Умная колонка Яндекс Станция Лайт YNDX-00025P (ультрафиолет) стоимостью 179,00 (сто семьдесят девять) белорусских рублей 00 копеек:** Фролова И.Р., Баранова Н.П., Ярошевич П.С., Наумчик А.Э.

**Победители, выигравшие Приз 7 Сертификат на услуги по проведению культурно-зрелищных детских мероприятий (на организацию детского праздника) номиналом 1000 (одна тысяча) белорусских рублей.** Срок действия до 01 сентября 2025 г. стоимостью 1000,00 (одна тысяча) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 118,34 (сто восемнадцать) белорусских рублей 34 копейки: Войтешонок Е.В., Титова Ю.Ф., Кохан И.А., Дятко Е.А.

**Победители, выигравшие Приз 8 Умная колонка Яндекс Станция Лайт YNDX-00025G (мята) стоимостью 179,00 (сто семьдесят девять) белорусских рублей 00 копеек:** Сафарян Е.И., Войтешонок Е.В., Лукъянец К.В., Григорович К.Г.

**Победитель Главного приза Сертификат на семейную (3 человека) поездку в Дубай (ОАЭ) с посещением парка развлечений «IMG Worlds of Adventure» на сумму 25000,00 (двадцать пять тысяч) белорусских рублей сроком действия до 30 июня 2025 г. стоимостью 25000,00 (двадцать пять тысяч) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 3704,55 (три тысячи семьсот четыре) белорусских рубля 55 копеек:** Климович К.А.

**Призовой фонд разыгран полностью.**

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: **+375 (33) 6961716.**

*Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 172 (30306) от 04.09.2024 г.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «МГЦН» 17 января 2025 года проводит повторный открытый аукцион по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы в БАВ | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель –** Открытое акционерное общество «Рыбокомбинат «Любань», тел.: 801794 68350, 68352 | | | | | | |
| 1 | **Минская область, Любанский район, г. Любань, ул. Боровика 6/1** | 1961,50 | 1,25 (490 БАВ за всю площадь) | 2612,72 | Здание специализированное для производства продуктов питания, цех по производству рыбных консервов | Отдельно стоящее одноэтажное здание, наличие отопления и технологического оборудования, санитарного узла, естественного освещения, энергоснабжения, водоснабжения, газоснабжения, канализации, пожарной сигнализации, отдельного входа. Аренда помещения с оборудованием. Стоимость аренды оборудования 20 333,00 рублей с НДС. **Срок аренды – 1 год** |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Форма торгов – открытый аукцион на повышение начальной цены.

Аукцион состоится **17 января 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 30 декабря 2024 г. по 15 января 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе:**

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Для участия в аукционе лица, желающие участвовать в нем, подают организатору заявления на участие в аукционе с приложением следующих документов:

- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901. **Назначение платежа – задаток для участия в повторном аукционе 17.01.2025 по предмету аукциона № 1.** Сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов;
- копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;
- копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

**При подаче заявления на участие в аукционе:**

физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, желающие участвовать в аукционе, предъявляют документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет: документ, удостоверяющий личность; доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель; документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), – если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, составленные на иностранном языке, должны представляться (предъявляться) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариально).

**Порядок определения победителя аукциона:**

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества, находящегося в частной собственности, утвержденным организатором аукциона (далее – Порядок).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

**Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):**

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Дополнительная информация:**

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Порядком, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона).

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – +375 (17) 366 36 58.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

*Да юбілеяў Галіны Макаравай і Віктара Тарасава*

# КУПАЛАЎСКІЯ ЗОРКІ НЕ ЗГАСАЮЦЬ



На гэтым фота яны разам, дзве зоркі Купалаўскага тэатра, два народныя артысты. Сцэна са спектакля «Вечар» па п'есе Аляксея Дударава. Двое самотных старых, ён і яна, з тужлівай надзеяй угледаюцца ў далеч, чакаючы кагосьці роднага... Гэтыя акцёры ўмелі іграць так, што ім не проста верыш — а суперажываеш, яны робяцца табе блізкімі... У абаіх у гэтым годзе юбілей, з розніцай у два дні і пятнаццаць гадоў. Галіна Макарава нарадзілася 27 снежня 1919 года, Віктар Тарасаў — 29 снежня 1934 года. Пра абаіх ёсць што цікавага згадаць...

## Матагоншчыца і ўсесаюзная бабуля

Напрыклад, ці ведалі вы, што Галіна Макарава, якая праславілася такімі натуральнымі для яе вобразамі простых сялянак, была дачкой афіцэра царскай арміі, і яе сапраўднае імя — Агата Чаховіч? Дзед, дарэчы, быў святаром Слуцкай епархіі. Выгнаў сына з дому, калі той кінуў законную жонку дзеля маладой прыслугі, на дваццаць чатыры гады маладзейшай за яго — яна і стала маці будучай актрысы.

Агата з дзяцінства вылучалася гарэзным характарам, ёй нават мянушку далі ў сям'і Бубен. Каб не рэвалюцыя, хто ведае, як склаўся б лёс... Але стала дачкой «пазбаўленца», белагвардзейца. Не хацелі з-за няправільнага паходжання нават прымаць у студыю пры 1-м Белдрамтэатры, будучым Купалаўскім... Добра, дапамог бацька сяброўкі, які працаваў у Наркамасветы. Толькі давялося змяніць прозвішча на больш «вясковае»: Агата Чаховіч зрабілася Апанашчык, па маці. Усе дакументы пра бацьку-афіцэра сям'я знішчыла.

На ўступных экзаменах у студыю Агата Апанашчык чытала «Курган» Янкі Купалы.

Потым сяброўка скажа, што Агата неяк запроста гучыць, і юная актрыса стала Галінай.

Яшчэ раз успомніце ролі Галіны Макаравай, якую называлі «ўсесаюзнай бабуляй»... Сціплая, мудрая, стомленая жыццём немаладая жанчына. І супастаўце з такімі звесткамі: маладая актрыса Галіна Апанашчык займалася верхавой яздой, кіданнем дзіды і гонкамі на матацыклах. У 1937 годзе стала чэмпіёнкай рэспубліканскага мотакросу і адзінай дзяўчынай-удзельніцай.

А Макаравай яна зрабілася, калі закахалася ў афіцэра НКУС Івана Макарава, прыгажуна, які прыходзіў на ўсе спектаклі і за кулісы, і вельмі прыгожа заляцаўся. За мужам з'ехала аж на Кольскі паўвостраў, на месца яго новай службы. Нарадзіўся сын.

Калі пачалася вайна, муж пайшоў на фронт. Макараў выжыў, вось толькі вярнуўся з вайны з іншай жанчынай. І Галіна Макарава, якая ў Маскве прайшла ўжо пробы ў тэатр імя Вахтангава, пасля разводу вярнулася ў Мінск. І стала актрысай Купалаўскага тэатра. Тут сустрэла свайго другога мужа, калегу па сцэне Паўла Пекура, з якім пражыла шчаслівае жыццё. Але не сказаць, што ўсё было лёгка... Кажуць, галоўную ролю ў спектаклі Андрэя Макаёнка «Лявоніха на арбіце» Галіна Макарава атрымала толькі тады, калі драматург паставіў гэта ўмовай: ці ігрaе Макарава, ці ён забірае п'есу.

У п'есах Макаёнка актрыса іграла часта, некаторыя ролі драматург пісаў спецыяльна для яе.

Аляксей Дудараў жа прызнаваўся: што калі падлеткам пабачыў Макараву ў фільмах, быў упэўнены, што яна зусім не іграе — проста вось такая жанчына ёсць, якую здымаюць у розных яе жыццёвых абставінах.

На Галіну Макараву спецыяльна прыходзілі ў тэатр гледачы... А калі яна пачала здымацца ў кіно, любоў стала ўсесаюзнай. Першая зорная роля — у фільме Сяргея Мікаэляна «Удовы» 1976 года. Спачуваючы гераіні, плакала ўся краіна.

Мне давялося бачыць Галіну Макараву на здымачных пляцоўках, калі я маленькай здымалася ў масоўцы «Беларусьфільма». Памятаю, як здзівіла, што вось гэтая такая простая, такая добрая бабуля насамрэч — вядомая актрыса, а не яшчэ адна з масоўкі. Памятаю, як да яе падыходзілі нейкія цётачкі, каб нешта распавесці асабістае, падзяліцца сваім няхітрым кінематаграфічным досведам, здабытым у масоўцы, не ведаючы, што размаўляюць з народнай артысткай СССР. Галіна Макарава цярпліва слухала, ківала галавой, усміхалася...

Пра яе дабрыню хадзілі легенды. То скупіць усё марожанае ў шапіку, каб раздаць класу дзетдомаўскіх дзетак... То ўбачыць, што ў двары на лаўцы спіць нейкі п'янтос — выйдзе з дому, пакладзе небараку пад галаву падушку, накрые пледам... П'янтос, праўда, праспаўшыся, знайшоў дабрадзейку, прынёс ёй цукеркі і кветкі...

Памерла яна ў 73 гады, калі паехала на лецішча даглядаць кветкі... Вельмі ж захаплялася вырошчваннем кветак. Іх любіў маляваць яе муж, Павел Пекур, а яна па яго карцінах рабіла вышыўкі. Адмыслова атрымлівалася, кажуць.

## Як старажоўскі хуліган стаў акумулятарам сцэны

А маладзейшы за Галіну Макараву яе калега па купалаўскай сцэне Віктар Тарасаў у тэатр трапіў, лічыце, выпадкова. У акцёры не збіраўся. У дзяцінстве быў сапраўдным хуліганам, уся мінская Старажоўка ведала іх банду. Адночы нават змусіў настаўніка, які несправядліва ставіў двойкі дзяўчынцы-яўрэйцы, каб тую адлічылі са школы, спыніць пераслед — прыгразіў нажом. А дакументы ў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут падаў за кампанію з сябрам Генадзем Аўсяннікавым (яшчэ адзін купалавец і народны артыст, у якога хутка юбілей). Хаця перад гэтым абодва марылі пра мараходнае вучылішча. Наважыцца на паступленне дапамагло і тое, што «на актрысу» паступала дзяўчына, у якую Віктар Тарасаў быў закаханы. Дзяўчына ў акцёрскай прафесіі так і не адбылася, лёсы іх не злучыліся, а вось Віктар Тарасаў сваё пакліканне не прамінуў... Хаця на экзамене ў сачыненні зрабіў 29 памылак, адразу пасля заканчэння інстытута быў залічаны ў трупу Купалаўскага тэатра.

Дэбютаваў у кіно ў 1960 годзе ў экранізацыі «На ростанях» Якуба Коласа. Рэжысёрам быў легендарны Корш-Саблін, а Тарасаву дасталася роля маладога селяніна Аксёна Каля, шукальніка справядлівасці. Колас апісвае героя так: «Гэта яшчэ малады чалавек, гадоў за трыццаць. Рысы яго твару строгія, нават халодныя. Вочы ўдумлівыя, і ўся сухарлявая і моцная постаць выкрывае ў ім чалавека выдатнага. Кароткія чорныя вусы шчыльна туляцца каля самых губ упартымі завіткамі і робяць твар яго прыгожым і энергічным». У прынцыпе, падбіраючы артыста, стваральнікі фільма не памыліліся: апісанне падыходзіць і да самога Віктара Тарасава.

Дачка гаварыла, што Тарасаў так казаў пра сваю працу: «Ведаеш, больш за ўсё гэта падобна на тое, быццам я акумулятар і мяне падсілкоўвае вялікі генератар».

На Віктара Тарасава таксама хадзілі гледачы... Хоць ён увесь час бурчэў, што сумняваецца ў выбары прафесіі, а ў кіно і ўвогуле здымацца не любіць. Усялякае бывала... У фільме «Маці ўрагану» па п'есе Уладзіміра Караткевіча Віктар Тарасаў іграў пракажонага. Па сцэнарыі яго павінны былі хаваць. Здымалі сцэну ў кар'еры. Пачалі пясочкам прысыпаць акцёра ў яміне, каб праўдападобней... А пясок і абсунуўся... Ледзь не задыхнуўся тады акцёр.

Наколькі быў патрабавальны да сябе, сведчыць факт, што аднойчы адмовіўся ад ролі караля Ліра, якую яму прапанаваў рэжысёр Валерый Раеўскі. Быў надзвычай харызматычны, кажуць, у яго ўлюбляліся ўсе партнёркі па сцэне. У 23 гады стаў заслужаным артыстам БССР, у 29 — народным артыстам БССР, у 48 — народным артыстам СССР. Памёр у 2006 годзе.

Жонка яго, таксама калега па сцэне, у адным з інтэрв'ю расказала, што з нараджэннем Віктара Тарасава таксама звязана таямніца: высветлілася, што ён нарадзіўся ад першага шлюбу маці, пра які ў сям'і не гаварылі, — зусім юнай пакахала старавера, жыла з ім у пасяленні ў тайзе, потым уцякла.

Жыццё таленавітых людзей, якія стварылі столькі запамінальных вобразаў, і само можа стаць драматургічным матэрыялам... А нам застаецца пераглядаць відэазапісы спектакляў і кінастужкі, чытаць успаміны... І не забывацца пра тых, хто ствараў беларускую культуру.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ**
**НА ПРАВО РАЗМЕЩЕНИЯ СРЕДСТВ РЕКЛАМЫ НА ГОСУДАРСТВЕННОМ НЕДВИЖИМОМ ИМУЩЕСТВЕ В г. ГОМЕЛЕ**

Торги проводятся **30.01.2025 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, пр. Ленина, 3, комн. 501. Организатор торгов –
**Коммунальное производственное унитарное предприятие «Гомельский городской информационный центр»,**
г. Гомель, ул. Красноармейская, 34а, пом. 1, УНП 400564635, тел. 8 (0232) 341667, www.gomel.gov.by. Форма торгов – открытый аукцион

| № предмета торгов | Место размещения средства наружной рекламы | Вид средства наружной рекламы | Размер рекламного поля, мм | Площадь рекламного поля, кв. м | Количество рекламных полей, ед. | Общая площадь рекламных полей, кв. м | Начальная цена предмета торгов, руб. | Размер задатка, руб. | Обязательные условия |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | **Перекресток ул. Федюнинского – проезд на иностранное унитарное предприятие «Мультипак»** | Мультимедийная рекламная конструкция | 4000X2242 | 8,97 | 2 | 17,94 | 753,48 | 753,48 | Вертикальная ориентация |

Технические требования и условия размещения средств наружной рекламы:

- средства наружной рекламы должны соответствовать требованиям СТБ 1581-2008 «Средства наружной рекламы. Общие технические требования и определения»;

- средства наружной рекламы должны размещаться в соответствии с требованиями к размещению средств наружной рекламы в пределах придорожной полосы (контролируемой зоны) автомобильной дороги, красных линий улиц, дорог или площадей населенных пунктов к постановлению Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 г. № 395.

Документы на участие в торгах принимаются по **27.01.2025 г.** включительно с 9.00 до 13.00 и с 13.30 до 15.00; в рабочие дни с понедельника по пятницу по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34а, пом. 1, тел. 34-16-67. Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются.

Торги проводятся в форме открытого аукциона на повышение начальной цены в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 7 июля 2021 г. № 395.

Задаток в размере начальной цены каждого предмета торгов должен быть внесен не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов: Государственного предприятия «ГГИЦ» № BY62AKBB30120453053673000000 Гомельское областное управление № 300 ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, БИК AKBBBY2X, УНП 400564635, получатель – Государственное предприятие «ГГИЦ» (назначение платежа – задаток для участия в аукционе на право размещения средства наружной рекламы по лоту № (указать номер лота).

Лицо, желающее принять участие в торгах, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах, обязано заключить с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов и предоставить организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах установленной формы;

- эскиз средства наружной рекламы в увязке с конкретной архитектурно-планировочной ситуацией по месту его размещения, выполненный на бумажном носителе в цвете;

- копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на расчетный счет организатора торгов;

- заверенную копию документа, подтверждающую полномочия руководителя юридического лица.

При подаче документов для участия в торгах и заключении соглашения:

- физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, предъявляет организатору документ, удостоверяющий личность;

- представитель физического лица, в том числе индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Оплата цены продажи предмета торгов осуществляется победителем торгов (приравненным к нему лицом) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов за вычетом внесенной им суммы задатка.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (приравненным к нему лицом) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Задаток возвращается всем участникам торгов, кроме победителя торгов (лица, приравненного к победителю торгов), в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается.

До проведения торгов с участниками заключается соглашение, в котором предусмотрены права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения торгов, в том числе и размер штрафа, уплачиваемого участником, выигравшим торги, но отказавшимся или уклонившимся от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам торгов, и (или) возмещения затрат на организацию и проведение торгов, и (или) перечисления суммы средств, за которую продан предмет торгов; участниками, отказавшимися объявить свою цену за предмет торгов в случае, когда такое объявление предусмотрено законодательством, в результате чего торги признаны нерезультативными. В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов», размер штрафа установлен в размере 70 базовых величин за каждый лот.

В соответствии с пунктом 6 Положения о порядке выдачи, продления действия, переоформления и прекращения действия разрешения на размещение средства наружной рекламы, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 (далее – Положение), победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан не позднее 10 рабочих дней со для утверждения протокола торгов подать в Гомельский городской исполнительный комитет заявление по форме согласно приложению 3 к Положению и иные документы, предусмотренные в регламенте административной процедуры по получению разрешения на размещение средства наружной рекламы, утвержденном Министерством антимонопольного регулирования и торговли.

Договор на размещение (распространение) наружной рекламы с победителем торгов (приравненным к нему лицом) заключается в течение 10 рабочих дней со дня регистрации заявления на выдачу разрешения на размещение средства наружной рекламы, при условии оплаты цены продажи предмета торгов и возмещения затрат организатору торгов.




А вы ведалі?

# Народная кухня з еўрапейскай гісторыяй

## Хто прыдумаў «футра» і прычым да заліўнога чорная ікра?



**З даўніх часоў за навагоднім сталом замацаваўся шэраг традыцыйных страў, без якіх Новы год ужо не ўспрымаецца як самае доўгачаканае зімняе свята. Акрамя класічных мандарынаў і ананасаў, на стале амаль кожнай сярэднестатыстычнай сям'і абавязкова прысутнічаюць салаты «Аліўе», «Селядзец пад футрам» і заліўное. Мы даведаліся, адкуль пайшлі гэтыя кулінарныя вынаходкі, якія ўжо можна смела лічыць стравамі народнай кухні.**

### ПАД РУЖОВЫМ ФУТРАМ

Яшчэ ў XIX стагоддзі ў Германіі, Нарвегіі і іншых еўрапейскіх краінах былі папулярныя салаты, падобныя па складзе да знаёмага нам «Селядца пад футрам». Да гэтай рыбы, якая была па кішэні нават сялянам, дадавалі сваю агародніну. У Англіі дадавалі свежы яблык і салёныя агуркі, а ў Германіі гэтыя інгрэдыенты замянялі на цыбулю і вараную моркву.

У другой палове XIX стагоддзя такая салата дайшла і да Расіі. Паводле адной з версій, прататыпам сучаснага «Селядца пад футрам» стала рыбная закуска, якую ў 1880-я гады стварыў кухар маскоўскага рэстарана «Расія» ў гонар каранацыі Аляксандра III і імператрыцы Марыі Фёдараўны. Тады на кавалачкі фарэлі кухар выклаў агародніну, у ліку якой былі буракі і рэпа, і ўпрыгожыў страву соусам з анчоусамі. Кулінарны шэдэўр назвалі «Каранацыйная гатчынская фарэль пад футрам», аднак назва атрымалася каламбурнай і паходзіла на насмешку з імператрыцы, таму ў меню рэстарана «Расія» салата ўвайшла пад назвай «Футра», больш адаптаваная для гараджан — без рэпы з анчоусамі.

### БЕЗ РАБЧЫКАЎ І ІКРЫ

Як вядома, салата «Аліўе» атрымала назву ў гонар шэф-кухара Люсьена Аліўе, які трымаў у 60-х гадах XIX стагоддзя ў Маскве рэстаран парыжскай кухні «Эрмітаж». Каб здзівіць сталічных жыхароў, кухар прыдумаў аўтарскую салату, у аснове якой былі кавалачкі мяса рабчыкаў і курапатак. На цэнтры блюда горкай узвышаліся кавалкі бульбы, яек і карнішонаў. Упрыгажэннем стравы па краях талеркі былі ракавыя шыйкі, кавалачкі цялячага языка, ікра. Аднак госці рэстарана адразу змяшалі разам усе інгрэдыенты. Кухар Аліўе не пакрыўдзіўся, а прыняў да ведама такую форму падачы, якую потым прэзентаваў і сам. Салата вельмі палюбілася масквічам і гасцям сталіцы, праславіўшы французскага кухара.

За амаль 150-гадовую гісторыю рэцэпт неаднойчы змяняўся: яго інгрэдыенты былі заменены на больш даступныя для рабочых. Так, мяса рабчыкаў і курапатак замянілі на мяса курыцы або вараную каўбасу, а ў гады перабудовы савецкія людзі сталі дадаваць у «Аліўе» вараную моркву, свежы яблык і агуркі.

### НАШЧАДАК ХАЛАДЦУ

Слова «заліўное» ведалі яшчэ ў XVI стагоддзі, але разумелі пад ім хутчэй тое, што мы сёння лічым халадцом — страву з розных відаў вываранага мяса або рыбы з каламутным застылым булёнам. Па сутнасці, заліўное ў сучасным выглядзе — гэта той жа халадзец, больш эстэтычны вонкава, празрысты і акуратны. Дзякуй за гэта трэба сказаць французскім кухарам, якія працавалі ў пятроўскай і пасляпятроўскай Расіі XVIII стагоддзя.

Сутыкнуўшыся з рускімі кулінарнымі традыцыямі, французы ўзяліся іх «акультураваць», каб звыклыя стравы прыгожа выглядалі на стале. Перш за ўсё, калі казаць пра заліўное, яны сталі выкарыстоўваць роўныя кавалкі мяса, упрыгожваць гатовыя стравы зелянінай і гатаваць празрыстыя булёны.

Выпрацаваная тэхналогія асвятлення заключалася ва ўжыванні так званай адцяжкі — узбітых яек ці ікры. Гэтыя прадукты, а дакладней бялкі, якія ёсць у іх саставе, валодаюць уласцівасцю «забіраць» усе каламутныя элементы ў булёне. У дарэвалюцыйныя часы булён для заліўнога і напраўду асвятлялі ікрой — чорнай. Цяпер гэтыя метады па кішэні не кожнаму, таму гаспадыні карыстаюцца такім варыянтам адцяжкі: фарш, вада, яечны бялок.

І важна адзначыць, што хоць заліўное і асацыюецца ў першую чаргу з рыбай, гатавалі і гатуюць яго з чым заўгодна: з курыцай, ялавічынай, свінінай, грыбамі. Асабліва смачны заліўны ялавічны язык.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

28 СНЕЖНЯ Даты Падзеі Людзі




**1324** год — тэўтонскія рыцары напалі на Мядзельскі замак (размяшчаўся на востраве возера Мядзель) і разбурылі яго.

**1911** год — нарадзіўся Павел Віктаравіч Мажэйка (в. Сапожкі, цяпер у Кармянскім раёне), Герой Савецкага Саюза. Скончыў Арэнбургскую школу лётчыкаў. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 года — у складзе штурмавой авіяцыі на Паўднёва-Заходнім, Варонежскім, 1-м і 4-м Украінскіх франтах. Маёр Мажэйка вызначыўся ў баях за Карпаты ў жніўні 1944-га — лютым 1945 года на тэрыторыі Венгрыі і Чэхаславакіі. Здзейсніў 112 баявых вылетаў з мэтай знішчэння жывой сілы і баявой тэхнікі праціўніка.

**1931** год — у Мінску прайшоў Першы Усебеларускі з'езд добраахвотнага таварыства садзейнічання развіццю аўтамабілізму і паляпшэнню дарог.




**1895** год — нямецкі фізік Вільгельм Рэнтген у Вюрцбургу ўпершыню аб'явіў пра вынаходства ім з'явы, якую ён назваў X-праменямі. Гэтым быў абазначаны невядомы да таго тып электрамагнітнага выпраменьвання, якое пазней назвалі рэнтгенаўскімі праменямі. За адкрыццё гэтай з'явы вучоны ў 1901 годзе быў узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй у галіне фізікі.

**У тым жа годзе** ў Парыжы (Францыя) адбыўся першы публічны паказ «Сінематографа братоў Люм'ер», што азнаменавала нараджэнне кінематографа.

**1899** год — нарадзіўся Міхаіл Сяргеевіч Малінін, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, генерал арміі. Удзельнік савецка-фінскай вайны (1939—1940). У Вялікую Айчынную вайну начальнік штаба 16-й арміі Заходняга фронту, начальнік штабоў Бранскага, Данскога, Цэнтральнага, Беларускага і 1-га Беларускага франтоў. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні аперацый па разгроме нямецка-фашысцкіх войскаў пад Масквой, Сталінградам і Курскам, у Беларускай аперацыі 1944 года, Варшаўска-Познаньскай, Усходне-Памеранскай і Берлінскай аперацыях 1945 года. Імем Малініна названа вуліца ў Мінску.

Скажыце, доктар...

# СВЯТА ЖЫВАТА

## Як не пераесці на Новы год?

**Навагодняе застолле і наступныя святы часта прыносяць не толькі радасць, але і харчовыя расстройствы. Маянэзныя салаты, засмажаная курыца з хрумсткай скарыначкай, пірагі, саленні, ды яшчэ і ў кампаніі з алкагольнымі напоямі... Як тут утрымацца і не пасмакаваць усё? Якія правілы трэба выконваць, каб навагодні стол быў у радасць, а не стаў выпрабаваннем для арганізма, нагадала ўрач-хірург 11-й гарадской паліклінікі Анастасія ПАТАПОВІЧ.**



***— Якое галоўнае правіла паводзін за навагоднім сталом?***

— Не пераядаць. Багацце страў можа спакусіць, але варта старацца не запаўняць талерку да краёў. Лепш каштаваць невялікія порцыі розных закусак. Гэта дапаможа пазбегнуць перагрузкі страўніка.

Калі адчуваеце, што сытыя, спыніцеся. Не трэба даядаць толькі з-за таго, што засталося шмат ежы. І ў цэлым пазбягайце цяжкіх, тлустых і вострых страў, якія могуць выклікаць дыскамфорт. Замест гэтага лепш аддаваць перавагу лёгкім салатам, запечаным ці вараным стравам.

***— Рэдкі святочны стол абыходзіцца без алкагольных напояў, якія часта запіваюць салодкай газіроўкай ці сокамі...***

— Калі вы плануеце піць алкаголь, трэба выбіраць якасныя напоі. І тут галоўнае правіла — умеранасць ва ўжыванні. Спыніцеся на адным, максімум двух бакалах. І, як вядома, розныя спіртныя напіткі лепш не змешваць, таму абмяжуйцеся адным ці двума відамі. А салодкіх кактэйляў лепш увогуле пазбягаць: цукар толькі ўзмацняе пахмелле. Каб знізіць нагрузку на печань і пазбегнуць абязводжвання, у перапынках паміж ужываннем алкагольных напояў трэба піць звычайную ваду.

У якасці закусак да моцных напояў трэба аддаваць перавагу бялковым стравам (мясу, рыбе, сырам) і агародніне. Гэта запавольвае абсорбцыю алкаголю і дапамагае пазбегнуць рэзкіх скачкоў цукру ў крыві.

***— Ці ёсць спосаб аблегчыць ранішнія пакуты, калі ўсё ж такі дазволіў сабе лішняга?***

— Добрай прафілактыкай пахмелля стануць выпітая перад сном шклянка вады і вітамінавы комплекс, які падтрымае арганізм.

**Алена КРАВЕЦ.**

### Важныя правілы застолля

**Не прапускайце прыёмаў ежы на працягу дня.** Калі прытрымлівацца правілаў здаровага харчавання, то трэба пяць ці шэсць прыёмаў ежы ў дзень у адзін і той жа час, і есці пры гэтым невялікімі порцыямі. Пропуск можа справакаваць галаўны боль, пагаршэнне стрававання, а ў некаторых выпадках нават стаць прычынай галавакружэння і страты прытомнасці.

**Не есці хаатычна, смакуючы ўсё запар.** Толькі ўявіце, як набіваецца ваш страўнік, калі вы кідаеце туды ўсё разам? Навошта вам такі «кактэйль»? І ці не нагадвае гэта смеццязборнік? Прыемней і карысней смакаваць усё мерна — адна страва за іншай.

**Выконваць чарговасць страў.** Пачынайце з салаты, а пасля прыступайце да чагосьці больш сытнага. І спачатку ешце стравы халодныя, потым гарачыя — гэта не толькі правільна, але і прыемна для смакавых рэцэптараў.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 722. Індэкс 63850. Зак. № 2862.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 снежня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12